

Паэт Леў Баляслаўскі пісаў, што творца не марнуе час на пошукі багацця, бо знаходзіць іх у сваёй душы. А Рамэн Ралан сцвярджаў, што адно толькі і ёсць шчасце тварыць. На яго думку, жывы толькі той, хто захоплены творчасцю, астатнія – цені, якія блукаюць па зямлі, чужыя для жыцця.

Ёсць людзі, якія не жадаюць быць проста ценямі, таму ў кожнага з іх сваё захапленне, кожны імкнецца развіваць свае таленты. А галоўнае – яны ўмеюць быць шчаслівымі ад стасункаў з мастацтвам і знаходзяць неверагоднае задавальненне ад таго, што самі могуць адчуваць сябе творцамі.

Прадстаўляем новага аўтара. **Ульяна ШАРОВА** - адзінаццацікласніца СШ №6 г. Смаргоні. Яна лічыць сябе творчым чалавекам, бо з ранняга дзяцінства пішыць вершы, займаецца музыкай, захапляецца іншымі відамі мастацтва. Менавіта таму вырашыла пасля заканчэння сярэдняй школы паступаць на факультэт культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці.

Вершы Ульяна піша па-руску і па-беларуску. Іншы раз з-пад пяра юнай паэтэсы з’яўляюцца верлібры, а часам дэманструе свае рэпарцёрскія здольнасці на сваёй старонцы ў Вайберы і на мясцовым смаргонскім тэлебачанні.

А мне прысніўся сон учора:
блукаючы па берегах марскіх,
ты ведаў: абміне нас тое гора,
і хопіць нам кахання на дваіх.

Ты слухаў голас недарэчны мой
І адчуваў маё дыханне.
З табой я атрымала б супакой.
І не адчула б сэрца развітанне.

Як моцна ты хацеў мяне кахаць,
А я – да твайго сэрца прытуліцца.
Мяне ты марыў ад усіх абараняць,
Ды дзверцы запеветнай не адкрыцца.

Тваё імя запомню назаўсёды,
святло ў вачах тваіх наноў знайду,
і раптам без прычыны і нагоды
у лепшых снах я да цябе прыду.

**Мой зварот**

Пра цябе я чытала ў кнігах,
аблічча шукала тваё
пасярод цемрадзі
ў мігценні.
Хадзіла рознымі
шляхамі
і доўгі час шукала
для сэрца мілыя пачуцці.
Я марыла
пра вечнае каханне,
дзе кожны вечар
ціха і пакорліва
мы тулімся адно да аднаго.
Малітвы пасылала ў неба,
і, запаліўшы Божае святло,
з вялікай верай у Яго,
укленчыўшы,
стаяла на каленях.
Я столькі часу
шукала там,
дзе быць кахання не магло.
Але так блізка
была мая любоў.
Мой Божа!
Цяпер я так удзячна
Табе,
за тое, што Ты мне адкрыў
мой шлях да шчасця.

**Осень**

За окном дождливая осень,
пусть она заберет печаль.
Он совсем не амбициозен,

твой немного уставший рояль.
Ты играл. Было ночью безлунно.
Ты пел, ты скучал и страдал.
Я любила тебя безумно,
ты такой любви и не знал.
Напевали клавиши эти,
что нам расставаться пора.
И звучало в каждом куплете:
«Всё игра, это просто игра».
За окном дождливая осень.
пусть она заберёт печаль,
мне останется на прощанье
серенада, что пел твой рояль.